




■ Рабі дабро

# ПЛЮС ТРЫСТА ТРЫЦЦАЦЬ

## Банк развіцця завяршыў праграму «Школьны аўтобус»

**З нагоды завяршэння сацыяльнай праграмы «Школьны аўтобус» каля будынка Банка развіцця арганізавана экспазіцыя пасажырскай аўтатэхнікі. А па выніках пяці гадоў існавання праграмы банк перадае ў рэгіёны 330 аўтобусаў, у тым ліку сёлета будзе адпраўлена 72 звышпраходных школьных аўтобусы для сельскай мясцовасці. Завяршаў праграму старшыня праўлення Банка развіцця Беларусі Сяргей РУМАС падчас цырымоніі перадачы 17 новых аўтобусаў абласным упраўленням адукацыі.**



Фота БЕЛТА.

«Банк накіраваў на рэалізацыю праграмы каля 20 млн долараў у эквіваленце. Хачу падзякаваць усім, хто прыняў удзел у гэтым маштабным праекце», — сказаў Сяргей Румас. Банк развіцця падключыўся да праграмы «Школьны аўтобус» у 2013 годзе. З 330 пастаўленых аўтобусаў 266 — вытворчасці МАЗа. Сяргей Румас адзначыў, што новую мадэль школьнага аўтобуса МАЗ будзе адгружаць на экспарт з крэдытнай падтрымкай Банка развіцця.

**Генеральны дырэктар Мінскага аўтамабільнага завода Дзмітрый КАЦЯРЫНІЧ** заўважыў, што да выканання праграмы МАЗ не выпускаў аўтобусы, распрацаваныя спецыяльна для перавозкі школьнікаў. «Гэта вялікая адказнасць. Мы ўлічылі ўсе заўвагі і прапановы нашых спажыўцоў. Удзячныя Банку развіцця, які быў не проста пакупніком, ставіў задачы, але і дапамагаў з арганізацыяй працоўкі. Таму мы змаглі сертыфікаваць новую мадэль усяго за 1,5 года», — сказаў ён.

Сёлета ў рэгіёны будуць перададзены аўтобусы новай мадэлі МАЗ-257. Новая мадэль абсталявана сістэмай відэаназірання і рэгістрацыі. Узровень шуму ў салоне зніжаны за кошт дадатковых шумапаглынальных матэрыялаў. Для большай надзейнасці ўбудаваная сістэма абмежавання хуткасці, якая не дазволіць разагнаць транспарт звыш 60 км/г.

Мінскі аўтазавод першым у СНД выпусціў школьны транспарт, які праектавалі спецыяльна для сельскай мясцовасці. У пачатку года школьны аўтобус паспяхова прайшоў выпрабаванні і даказаў сваю надзейнасць. Тэсты паказалі, што мадэль адпавядае ўсім патрабаванням бяспекі, прынятым у Беларусі, іншых краінах СНД і Еўропы.

Праграма «Школьны аўтобус» была рэалізавана МАЗам сумесна з Банкам развіцця Беларусі па даручэнні кіраўніка дзяржавы. Мэтай пяцігадовай праграмы было рашэнне праблемы дастаўкі сельскіх дзяцей у школу і назад.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

■ Надвор'е

# РЭЗКІ ПОДЫХ ХОЛАДУ

**Сёння аб'яўлены аранжавы ўзровень небяспекі з прычыны моцных дажджоў**

**Даволі вільготнае і халоднае надвор'е чакаецца ў Беларусі на працягу тыдня, паведамляе начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.**

Хоць сапраўды холадна будзе ў нас толькі ў працоўныя дні, а да выхадных ізноў пацяплее. Сёння ўмовы надвор'я на тэрыторыі Беларусі будуць вызначаць актыўныя атмасферныя франты ад цыклону, што перамяшчаецца з поўначы Украіны. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць дажджы, днём месцамі магчымы моцныя дажджы. У асобных раёнах чакаюцца навальніцы. Тэмпература паветра істотна панізіцца і складзе не больш за плюс 10—16 градусаў, на поўдні — да 18 цяпла.

Потым надвор'ем будуць кіраваць атмасферныя франты, а таксама халодныя і вільготныя паветраныя масы паўночных шырот. У сераду на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 6—12 градусаў, удзень — 10—17 цяпла. Чакаюцца кароткачасовыя дажджы ўдзень амаль паўсюдна па краіне і ў чацвер. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 5—11 градусаў, удзень — 10—17 цяпла. Адносна халодна прагназуецца і ў пятніцу. Тады на большай частцы тэрыторыі Беларусі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 6—12 градусаў, удзень — 12—19 цяпла.

Згодна з папярэднімі прагнозамі айчынных спецыялістаў, у выхадныя зноў пачне цяплець. У суботу надвор'е будзе вызначаць поле павышанага ціску, прыйдзе больш цёплае паветра з боку Цэнтральнай Еўропы. У асобных раёнах Беларусі прагназуюцца кароткачасовыя дажджы, уначы і раніцай чакаецца туман. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 6—11 градусаў, па захадзе краіны — 13 цяпла. Удзень сіноптыкі абяцаюць ужо плюс 15—21 градус, а па поўдні — да 22—24 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Жыллёвая палітыка

## Адраснае субсідзіраванне прафінансуюць шэсць банкаў

**Рынак жылля налета чакае істотнае ажыўленне. Акрамя Беларусбанка і Белаграпрамбанка, яшчэ чатыры фінансавыя ўстановы вырашылі ў 2018 годзе накіраваць свае сродкі на адраснае субсідзіраванне ў жыллёвым будаўніцтве па Указе №240.**

Гатоўнасць крэдытаваць насельніцтва па Указе №240 у 2017 годзе выявілі два асноўныя сістэмныя банкі, а ў 2018 годзе — Беларусбанк, Белаграпрамбанк, БПБ-Ашчадбанк, Прыорбанк, Белінвестбанк, БелВЭБ.

**Прэм'ер-міністр Андрэй КАБЯКОЎ** нагадаў, што тэма будаўніцтва жылля абмяркоўвалася два тыдні таму на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў. «Разам з дзеючымі схемамі льготнага крэдытавання (указы №13, 346 (будаўніцтва жылля ў вёсцы), кампенсацыя 50% стаўкі рэфінансавання), цяпер працуе новы інструмент — Указ №240. Сёлета па ім ужо знойдзены дадатковыя рэсурсы банкаў на 135 млн рублёў», — растлумачыў Андрэй Кабякоў.

На наступны год плануецца ўзмацніць механізм субсідзіравання грамадзян па новым Указе. На гэтыя мэты плануецца дадаткова прыцягнуць каля 400 млн крэдытных рэсурсаў. У праекце бюджэту на наступны год на субсідзіраванне грамадзян пад гэтыя крэдыты прадугледжана 50 млн рублёў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*


**РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о повторном открытом аукционе по продаже 5 машино-мест в г. Минске по ул. Платонова, 1Б**

| Наименование | Начальная цена продажи, бел. руб. | Задаток, бел. руб. |
|---|---|---|
| Лот №1. Изолированное помещение с инв. №500/D-708120655. Наименование: машино-место №85. Адрес: г. Минск, ул. Платонова, 1Б-152. Г. п. – 2007; этаж – 2-подземный уровень; общая площадь – 17,4 кв. м, ограждающие конструкции – разметка; материал покрытия – бетон | 14 288,40 | 1 420,00 |
| Лот №2. Изолированное помещение с инв. №500/D-708120656. Наименование: машино-место №86. Адрес: г. Минск, ул. Платонова, 1Б-153. Г. п. – 2007; этаж – 2-подземный уровень; общая площадь – 18,5 кв. м, ограждающие конструкции – разметка; материал покрытия – бетон | 15 163,20 | 1 510,00 |
| Лот №3. Изолированное помещение с инв. №500/D-708120657. Наименование: машино-место №87. Адрес: г. Минск, ул. Платонова, 1Б-154. Г. п. – 2007; этаж – 2-подземный уровень; общая площадь – 18,4 кв. м, ограждающие конструкции – разметка; материал покрытия – бетон | 15 066,00 | 1 500,00 |
| Лот №4. Изолированное помещение с инв. №500/D-708120658. Наименование: машино-место №88. Адрес: г. Минск, ул. Платонова, 1Б-155. Г. п. – 2007; этаж – 2-подземный уровень; общая площадь – 18,7 кв. м, ограждающие конструкции – разметка; материал покрытия – бетон | 15 357,60 | 1 530,00 |
| Лот №5. Изолированное помещение с инв. №500/D-708120659. Наименование: машино-место №89. Адрес: г. Минск, ул. Платонова, 1Б-156. Г. п. – 2007; этаж – 2-подземный уровень; общая площадь – 18,5 кв. м, ограждающие конструкции – разметка; материал покрытия – бетон | 15 163,20 | 1 510,00 |

УСЛОВИЯ

1. Победитель аукциона либо в случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект (Объекты) по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) (Претендент на покупку), обязан оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) не позднее 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола аукциона.
2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
3. Переход права собственности на приобретенный на аукционе Объект (Объекты) недвижимости, имущество должника осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 10.10.2017 г. в 11.00 по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 4. Шаг аукциона — 5%**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X.
Получатель — РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества (Машино-место №___ ) (Лот №____ ), проводимом 10.10.2017 (Партизанский МРО).
Участник аукциона, желающий принять участие в аукционе по нескольким лотам, вносит задаток в сумме, предусмотренной для каждого лота.
Организация и проведение аукциона, а также оформление и регистрация сделки осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в г. Минске, ул. Комсомольская, 11, каб. 6 в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00. Окончание приема заявлений – 06.10.2017 в 11.00.
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом(ами) аукциона. Контактное лицо для осмотра Объектов: Сувалов Юрий Петрович, тел.: 8 (029) 140-83-10; 8 (017) 290-93-46 (47).

Контакты организатора аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 550 09 52, 8 (029) 550 09 59, 8 (029) 356-90-03 • www.ino.by • torgi@ino.by


■ Здарэнні

## Дзеці выскачылі ад пажару ў акно

**У сталіцы трое дзяцей, ратуючыся ад пажару, выскачылі з акна другога паверха шматпавярховіка.**

Паведамленне аб загаранні ў кватэры па вуліцы Гарэцкага паступіла мінскім ратавальнікам а палове на другую гадзіну ночы.

На месцы падраздзяленні МНС устанавілі, што гарыць маёмасць і дзвярны блок у падсобным памяшканні кватэры на другім паверсе дзевяціпавярховага дома. У ёй пражываюць шасцёра дзяцей, тры з якіх былі шпіталізаваныя ў бальніцу ў выніку атрыманых траўмаў (удараў і ранак), якія яны атрымалі, выскокваючы з акна. Праз 15 хвілін пажар быў ліквідаваны. Яго прычынай стаў пакінуты гаспадыняй без нагляду масляны абагравальнік «Паларыс».

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## У Свіслацкім раёне выбухнуў... калодзеж

**У калодзежы, з якога чэрпалі ваду жыхары вёскі Алісеевічы, з'явілася вада з нейкім дзіўным прысмакам. Мясцовы жыхар вырашыў праверыць, у чым жа справа. І ў выніку трапіў на бальнічную койку.**

— У нядзелю ў 17.06 памочнік дзяжурнага Свіслацкага РУУС паведаміў, што гадзінай раней у цэнтральную раённую бальніцу, размешчаную ў горадзе, дастаўлены чалавек з тэрмічнымі апёкамі 1 і 2 ступені, якія занялі 20 працэнтаў плошчы цела, — паведаміла **афіцыйны прадстаўнік Гродзенскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях Наталля ЖЫВАЛЕЎСКАЯ**. — Ім аказаўся 42-гадовы жыхар вёскі Алісеевічы. Пацярпелы быў у прытомнасці і расказаў, што прыкладна 2—3 тыдні таму ён, карыстаючыся вадой з вясковага калодзежа, пачаў адчуваць у ёй прысмак бензіну. Але працягваў яе кіпяціць і спажываць. 1 верасня прысмак стаў настолькі невыносны, што вясковец вырашыў самастойна пачысціць калодзеж. У нядзелю ён вычарпаў адтуль 20 вёдзер вады і выцягнуў пластыкавую ёмістасць, якая выкарыстоўваецца для запраўкі бензаінструменту. Пасля чыркнуў запалкай, каб паглядзець, што ж адбываецца ўнутры калодзежа. Так і адбылася ўспышка...

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*

■ Падзея

## З'ЕЗДУ БЫЦЬ!

**II З'езд вучоных Рэспублікі Беларусь пройдзе ў чацвёртым квартале гэтага года.**

Пастановай Савета Міністраў зацверджаны склад арганізацыйнага камітэта па яго падрыхтоўцы і правядзенні. Узначаліў яго намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Уладзімір Сямашка.

Аргкамітэту даручана зацвердзіць план мерапрыемстваў па падрыхтоўцы з'езда і яго правядзенні, распрацаваць прынцыпы адбору прадстаўнікоў і парадак абрання дэлегатаў на з'езд.

Нацыянальная акадэмія навук Беларусі сумесна з Міністэрствам адукацыі, Міністэрствам культуры пры ўдзеле грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» павінна забяспечыць залучэнне маладых навукоўцаў, а таксама асоб, уключаных у банкі даных адоранай і таленавітай моладзі, да працы па падрыхтоўцы і правядзенні з'езда.

Нагадаем, што I З'езд вучоных Беларусі адбыўся дзесяць гадоў таму — у лістападзе 2007 года. У яго рабоце прынялі ўдзел каля 2,5 тысячы чалавек, у тым ліку 1987 дэлегатаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*